Вы прачыталі празаічны твор У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (дакладней, прачыталі адну яго частку, бо ўвесь гэты твор вялікі, на цэлую кнігу). Падумайце і адкажыце на пытанне: у чым яго адрозненне ад іншых празаічных твораў, з якімі вы пазнаёміліся ў 6-м класе і раней? Каб вам было лягчэй супастаўляць і рабіць вывады, даём наступныя пытанні:

У якіх творах змест часцей прыдуманы пісьменнікам, у якіх ён непасрэдна ўзяты з жыцця?

Дзе пісьменнік, ствараючы свае вобразы і карціны, звяртаецца да фантазіі, дзе ён строга прытрымліваецца сапраўдных фактаў, таго, што ён убачыў у жыцці?

У якіх творах мастацкія прыёмы, сродкі адыгрываюць галоўную ролю ў паказе жыцця, у якіх яны толькі дапамагаюць аўтару выказаць сваю думку, сваё меркаванне аб людзях, аб жыцці?

Перадайце сваімі словамі змест асобных частак твора: як выглядае беларуская вёска, як выглядае хата, якія стравы ў беларусаў, беларускае вяселле і г. д.

Як сам аўтар вызначае жанр свайго твора? Што такое нарыс? Да якога віду літаратуры ён адносіцца? Гл. слоўнік у канцы падручніка.

Як называецца навука, якая вывучае матэрыяльную, духоўную культуру народа, яго побыт? Якімі сваімі асаблівасцямі нарыс У. Караткевіча звязаны з гэтай навукай?

На аснове зместу твора напішыце сачыненне «Людзі зямлі беларускай».

*Яраслаў Пархута*

# АПОШНІ ГУСЛЯР

(Скарочана)

Нават спецыялісты сцвярджалі: гусляра ўжо не сустрэнеш на Беларусі, бо гуслі ў нас даўно выйшлі з ужытку. Не верылася.

Думалася: ну як жа так? Яшчэ на пачатку стагоддзя, паводле даных этнаграфіі, былі ў нас і гуслі, і гусляры. І чаму яны зніклі? З якой прычыны?

І раптам, зусім выпадкова, дачуўся: пад Маладэчнам, на хутары, жыве гусляр. У яго ёсць і гуслі. Самаробныя. А іграе — заслухаешся! Казалі яшчэ: калі хочаш пабачыць апошняга гусляра і ягоныя гуслі пачуць — не марудзь. Чалавек даўно разьмяняў дзевяты дзесятак!..

І вось я на станцыі Уша. Распытваю ў тубыльцаў, як трапіць у няблізкае адсюль урочышча Сакаўшчына. Адны паціскаюць плячыма, другія тлумачаць: па шпалах трэба прайсці назад, у напрамку Менска, да пераезда, павярнуць направа, а тады ўжо падацца пагорыстаю і звілістаю дарогай ажно да вёскі Відзеўшчына, цэнтра саўгаса «Прагрэс», адтуль — да вёскі Уланаўшчына, але, не даходзячы крайняй сялібы, збочыць і не вельмі

торнай сцяжынай ускрай лесу адмерыць яшчэ кіламетры два. Там, як бы на палянцы, пры пагорку, пад высознай бярэзінай і будзе хата дзеда Максіма, Такушэвіча па прозвішчу, Пятровіча па бацьку.

Прызнацца, усю тую дарогу побач з прадчуваннем незвычайнай сустрэчы жыло ўва мне і пачуццё зусім іншае. А раптам увялі ў зман? А раптам, калі ўсё тое і праўда, то мо спазніўся... Успаміналася чамусьці і Купалава паэма «Курган», яе асобныя радкі, што запалі ў душу яшчэ з часоў школьных:

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай...

Іду, але абапал дарогі — адзін лес. Бярэзіны, сосны, елкі. Там-сям трапляецца і чачотка ці, як яе яшчэ называюць, карэльская бяроза. А вось і масток. Пад ім прабягала рачулка. Меліяратары зрабілі сваю справу — рачулку выпрасталі, берагі перааралі. Вунь як высвечвае супесь!.. А пусткі?

Журботна рабілася ад убачанага. Ды зноў яны — радкі з паэмы:

Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала...

Дзед Максім! А ці яшчэ выходзіш на людзі з гуслямі сваімі? Ці запрашаюць цябе на хрысціны, вяселлі, запоіны? І ўвогуле, ці пачую твае гуслі-самагуды?

сядзіць гэты сумны, як лунь, белы дзед...

Гэта, як гаворыцца, штрых да партрэта гусляра таго, купалаўскага. А як выглядаеш ты, дзед Максім?

Таму і прыспешваю крок.

Зямля тут з суцэльных пагоркаў. На схілах лес — дзе мяшаны, а дзе выключна бярозавы ці сасновы. І толькі на ўсход — прагал. На канцы яго віднеецца крайняя хата Уланаўшчыны, крытая шыферам. Здалёк яна здавалася цацачнай. Далей — зноў ішлі аблесеныя пагоркі, як насыпаныя кімсьці курганы.

Хутар паказаўся раптоўна. Быццам з-за пагорка выбег — нейкі лахматы, натапыраны, абстаўлены рэдкімі прысадамі і нізкім учарнелым парканам,— і спыніўся ў нерашучасці: а што далей рабіць? Пасярод квактухаю масцілася прыземістая хата. Яна таксама ўчарнела, і толькі акенца давала знаць, што там яшчэ не пагасла жыццё. Справа ад хаты — хлявушкі, дрывотня.

Ля аднае прыбудоўкі, бачу, рвецца з ланцуга сабачка і не перастае цяўкаць. Ён, відаць, заўважыў мяне і даваў знаць, як спраўна службу нясе. Але я зразумеў ягоныя хітрыкі, наблізіўся, сказаў, каб дарма не падымаў галасу, бо яго ніхто не спалохаецца. І сабачка змоўк, разгублена завіляў хвастом ды сціх.

У тым, што жыве тут Максім Такушэвіч, не было ніякага сумніву: усё сходзілася.

Дзед Максім — высокі, хударлявы, сівы, з белымі вусамі і блакітнымі вачыма. Ні даць ні ўзяць — купалаўскі гусляр! Толькі хіба тае барады бракуе. Сядзіць насупраць на лаве і, як ён мовіў, пра жызню сваю расказвае:

— Я і нарадзіўся ў гэнай хаце! — чуецца яго спакойны голас.— Бацька мой сюды ў прымы прыйшоўшы быў. Зямлі меў гектараў з дванаццаць. Ды яна не вельмі была — болей пад кустамі ды камянямі. Але неяк жыў. Калі дзеці падраслі, аднаго сына аддзяліў, другога ў свет паслаў, а мяне пры сабе пакінуў. Я з ім на гаспадарцы і калупаўся. А выпадаў вольны час — майстэркай рознай займаўся. Вокны рабіў, дзверы, шафы, сталы, сані, вазы... Яшчэ малатарні. Драўляныя. Дзе трэба жалезіна якая — сам і каваў яе. Марокі з малатарняю многа, але затое, як запусціш у работу,— ажно спявала. А парабілі калхозы, то ў калхоз і малатарню забралі. Файная была!.. І што з ёю зараз — не ведаю нават. Мо і спалілі дзе... Арфы таксама рабіў. Бывала, як прагоніш збожжа,— зернейка ў зернейка збіралася. І чысценькае... Ну, яшчэ каня падкаваць альбо плуга падправіць — таксама мая работа была... Калі агулам казаць, то я з малькосці ў рабоце. І зараз не магу без яе. З раніцы, як разварушышся, цалюткі дзень на нагах. А пад вечар паляжаць цягне. За ноч аддыхнеш, а зрання зноў за сваё.

Адкуль у мяне схільнасць да музыкі, пытаеце, і чаму з гуслямі судзьбу звязаў? А чорт яго ведае!.. Малым яшчэ быў, то, помню, балалайку зрабіў, скрыпку, нейкія цымбалы... Але якая то музыка была! Я ж і дзесяці гадочкаў не меў тады. Аднак іграў... Сказаць, каб ад бацькі ўсё тое пераняў,— не скажу. Ён добрай майстэркі не мог рабіць, не тое каб іграць. Ага. Дык пра сябе. Вось так, мала-памалу, і раптам зрабіў сабе гуслі. Хадзіў некалі тут па вёсках стары гусляр. Я гуслі ўбачыў і зрабіў. І строй неяк саздаў свой. Не пайму і зараз, як гэта ў мяне палучылася. Ніхто ж не вучыў! Строй гэны — самадумны. Нідзе такога не ўчуеш болей. А потым пайшло! І зрабіў я гусляў за жызню сваю па-

радачна. Колькі, пытаеце? Шмат! Штук з пятнаццаць будзе. А мо і болей. У каго ахвота да музыкі з'яўлялася, таму і аддаваў. Адны гуселькі нават сыну Мікалаю зрабіў на памяць. А гэныя, апошнія, сабе пакінуў...

Дзед Максім устае з лавы, падыходзіць да камода, апускаецца на калені, шарыць рукою недзе там, паміж камодам і сцяною, і, нарэшце, дастае адтуль гуслі. Яны адразу падалі голас — быццам нечаму ўзрадаваліся. І тут жа сціхлі. Гаспадар вяртаецца на сваё месца, апускае гуслі на калені, кажа:

— Во!..

Я ніколі не бачыў гусляў, не даводзілася і чуць іх. Таму рупіла адразу ж папрасіць, каб пайграў, каб паказаў, на што здатны яны. Але стрымліваю сябе, не перабіваю старога. І ён працягвае свой аповяд спакойна, не спяшаючыся:

— Гэныя гуселькі рабіў доўга. Пакуль загатоўкі здабыў, пакуль высушыў, пакуль выштукаваў — час прайшоў. Аднак спраўныя атрымаліся. Праўда, яшчэ не абыграліся як след, на мель струны не сталі, але нічога — абкатаюцца!..

Павёў рукою па струнах, нібы зноў іх абудзіў на хвіліну, і доўжыў:

— Як і з чаго раблю гуслі? Паслухайце! Мо згадзіцца. Не вам, то некаму... Плечы, гэта тое, што падыспадам, якія хочаш могуць быць — бярозавыя, асінавыя, кляновыя. У гэных — асінавыя. Бо асінавыя найлучча, я прызнаў. Самы лепшы звук даюць. І рабіць з асіны лягчэй. А бакі ды крывулю гэную найлепей з чачоткі рабіць. Грудзі — толькі з елкі. І то не абы з якой. Каторая гадзіцца, каторая не — я ўжо на пні знаю. Пагляджу — і ўсё тут. А струны? Струны таксама самаробныя. Каторая з кабелю тэлефоннага, каторая з каната. Нават самая таўстая, басовая,— свае работы. Узяў сталёвую струну і накруціў на яе медны дрот. Вот і атрымалася. Бо дзе ж ты купіш струны тыя? І бачыць не бачыў у продажы...

На гэты раз ён прабег па струнах пальцамі абедзвюх рук і мелодыю, што нарадзілася пад імі, не заглушыў далонямі, а нібы адпусціў на волю, сказаўшы:

— Я іграю тое, што прыходзе да мяне. Бо грамаці нотнай не вучаны.

Зноў прабег пальцамі па струнах і на гэты раз даў ім поўную волю. І яны загаманілі. Загаманілі так, што, здавалася, толькі тае хвіліны і чакалі, каб расказаць пра сябе і пра тое, што берaглі ў сабе мо не адзін дзень. Хата ўраз напоўнілася гукамі. У іх

было нешта спрадвечнае, запаветнае і надзвычай зямное. То чуўся подых вясновага ветру, то пошум баравін, то перазвон рачулак. І раптам у той подых, у той пошум, у той перазвон уліваюцца журботныя ноткі, нябачным вэлюмам агортваюць душу, прымушаюць задумацца. Нібы дзед Максім усё, што жыве ў ягонай душы, спрабуе пераліць у тваю, і ад таго робіцца табе неяк вусцішна. І сум, і роздум, і радасць — адначасова пасяляюцца ў сэрцы...

А якія лёткія рукі ў дзеда Максіма! Пальцы, вузлаватыя ад паўсядзённай сялянскай працы, нястомна бегаюць па струнах, вышукваючы патрэбны гук і дорачы яго табе нібы з выклікам: а дай ты такога фору, калі можаш!.. А не можаш — то слухай!..

І я слухаю.

— Пашукаю нешта іншае,— чую нібы скрозь сон словы дзеда Максіма.

Цяпер ён перабірае струны паволі, быццам сапраўды шукае між імі новую мелодыю, тое, што патрабавала зараз душа ягоная, тое, чым хацеў усцешыць і мяне. І я зноў апынуўся ў палоне новых гукаў.

Струны — пелі. Кожная па-свойму. Іншая падасць голас і адразу сціхне, быццам да чаго прыслухоўваецца. Іншая гамоніць даўгавата, усё адно як хоча расказаць пра сваё, толькі ёй вядомае, адвечнае, важнае. Іншая гаворыць не спяшаючыся, разважліва, нібы з разлікам пераканаць у нечым, запаланіць надзейна, адразу і надоўга. Яшчэ жывеш тым, што падарыла табе струна папярэдняя, а суседняя возьме раптам і перапыніць дарогу ёй, і пахваліцца сваім — маладым і задорным, і пакліча за сабою твае думкі, тваё сэрца — усяго цябе. Іншая, насуперак усім астатнім, як пакрыўджанае дзіцяня, возьме і раптам заплача. І тады плач той падхоплівае ці не ўся іхняя сямейка, і чуцён ён доўга — надрыўны і няўмольны. А потым нібы хто супакоіць тое дзіцяня, і яно ўжо смяецца і смех свой разлівае далёка наўкол. І здаецца ўжо: ты не ў хаце сядзіш, а ідзеш палявою дарогай, а над табою — трапяткі жаваранак. Але той жаваранак — толькі на нейкую хвіліну... Замест яго раптам узялі і зашчабяталі гаваркія ластаўкі. Яны шчабечуць-расказваюць пра сваю радасць нястомна.

Не стрымліваюся, пытаю:

— Гэта ваша музыка, Максім Пятровіч?

Зірнуў на мяне, варухнуў белым вусам, прамовіў:

— А чыя ж? Ува мне заўсягды нешта пяе. Ці ўдзень, ці

ўвечары, ці ўранні... Іншы раз лягу спаць, а заснуць не магу — здаецца, што ў вушах сам воздух іграе. Во, думаю, каб і мне гэтак! Устану, вазьму гуслі, пашукаю-пашукаю — і выходзе музыка! Добра нават выходзе!..

Ён зноў зірнуў на мяне і падсумаваў:

— Я чуў некалі такую гісторыю. Даўным-раздаўным сам цар Давід на гуслях іграў! Рашыў тады: а я хіба зломак? І дамогся свайго. Іграць магу нават не гледзячы на струны. Іграю, калі гуслі да мяне так і калі гэтак, наадварот, значыць. Мне ўсё адно — ці басамі яны да мяне, ці галасамі. Рукі самі струну патрэбную знаходзяць...

І нібы сказанаму ў доказ, павярнуў гуслі басамі да сябе. Пачуўся раздумлівы, нават маркотны найгрыш. Не абрываючы мелодыі, паскардзіўся:

— Памру, і ўсё маё пойдзе са мною... А чаму б культурнікам нашым, школцы не прыслаць каго да мяне. Казаў жа не раз: хто хоча вучыцца на гуслях — прыходзьце. Каб хоць! І не думаюць нават. Бо як жа! У іх цяпер магнітафоны ўсялякія, брынкалкі розныя... А каб гуслі — дык не...

Рыпнулі дзверы, і ў хату, услед за гаспадыняй, бабкай Ксеняй, увайшлі пара белых казлянят і шэры каток. Замэкалі, капыткамі зацокалі казляняты і — у запеч, пад ложак. А каток сходу ўзляцеў на шафу і адтуль толькі вачыма паблісквае.

Гаспадыня павіталася са мною нехаця, а мужу кінула:

— До брэнкаць! У магазін збегаў бы. Мо хлеба прывезлі. А то, пакуль збярэшся, раскупяць...

Дзед Максім нібы не пачуў папроку:

— Не любя музыкі,— прамовіў ціха.— А калі ў настроі — слухае-слухае ды раптам скажа: до-обра!..

Паказаў вачыма на запеч, на шафу, маючы на ўвазе казлянят і катка, дадаў:

— І яны таксама глухія да гусляў. Во сабака іншы то спец на гэта! Быў у мяне адзін... Бывала, сяду пайграць, а ён — падвывае. Памагае, значыць. Тон вядзе, як мае быць. Даволі ўдала мелодыю цягне. А Жулік,— хітнуў галавою на акно,— біздар! Кусацца толькі майстар. Не спусціш і з ланцуга. Чужога каго ўбачыць — адразу да ног кідаецца, каб на яго воўк...

Апранаючыся, дзед Максім не пераставаў хваліцца сваім:

— Я ўжо казаў: не толькі гуслі рабіў. Усё, што ў хаце, таксама сваімі рукамі... Камода з чатырма шуфлядкамі, шафа для адзежы, лавы, стол...

У сенцах дзед Максім прапанаваў:

— А давайма зазірнём сюды!

Адчыніў дзверы ў другую палавіну хаты і, тупаючы папе-радзе, тлумачыў:

— Майстроўня мая...

Сапраўды, куды ні ступі — усюды брусы, дошкі, плашкі. Пры сцяне, бліжэй да акна,— варштат. Паблізу яго — такарня. А на падлозе — апілкі, стружкі, абрэзкі.

— І варштат, і такарня — самаробныя. Служаць спраўна і даўно. Што хочаш і зробіш, і вытачыш. Габэлькі — таксама свае работы. І жалязкі да іх... Бо куплёнае нічога не вартае... А гэныя — ажно ліжуць дошку, як пацягнеш. І стружкі-габлюшкі ляцяць — толькі свішчуць!.. Вунь і жорны сам рабіў. Камяні, праўда, у аднаго чалавека дастаў, бо не было чым выбіць іх. І скажу вам, добрыя жорны былі. Колькі перамалолі збожжа — не злічыць. А цяпер — гуляюць... Во! — спахапіўся гаспадар.— У мяне яшчэ і кузня е. Хадзем, пахвалюся і ёю.

Выйшлі на панадворак, і тады толькі дзед Максім дастаў з кішэні муштук (вядома, самаробны!), на хаду ўправіў цыгарку і, нібы апраўдваючыся ў нечым, прамовіў:

— На фронце навучыўся, каб на яго ліха. За вайну ад радавога да камандзіра кулямётнага рашчота дайшоў. Паранілі колькі разоў. Выжыў. Справіўся. А з табакаю аніяк не спраўлюся...

Нарэшце спыніўся:

— Во яна, кузня мая. Бачыце?

Гляджу, і не бачу аніякай кузні.

— Ды во яна, у доле! — удакладняе гаспадар.— Не было дзе, то ў бліндажы прыспасобіў.

Цяпер толькі здагадваюся, што пры пагорачку, дзе віднеецца жоўты жвір, нібы ў зямлянцы, з якой знялі дах, і месціцца дзедава кузня. Падыходжу бліжэй. Абрэзак рэльса. Ціскі. Горан. Побач валяюцца ржавыя жалязякі — невялікія і нішто сабе. Чарнее ў куточку горбачка вугалю.

— Малая кузенка, але...

Я яго разумею.

Чалавек працы, самабытны майстар, паслугамі якога карысталіся некалі многія, ён і зараз не сядзіць склаўшы рукі. Ля горна, у пяску, зусім свежыя аплавіны шлаку, вакол рэльса-кавадла — сінім лускавіннем паблісквае акаліна. Усё гэта — сведчанне ягонай ненатольнай душы.

— Закінь мяне на які хочаш востраў — не прападу.

Зноў разумею дзеда Максіма. Вядома, выйсце знайшоў бы! Як усё жыццё знаходзіў тут, на хутары. Некалі ж побач і зямельку араў, і засяваў, хоць адорвала мізэрным ураджаем. Потым і соткі, і грады пры хаце меў. Нават зараз пару лапікаў абрабляе. Вядома, удалечыні той змайстраваў бы сабе і гуслі. Ды пялі б яны пра гэты вось край, пра гэтае вось неба, пра гэтае сонца, што спрабуе выскачыць з-за хмары,— пра любую сэрцу радзіму. Інакш бы не змог, уцёк бы з самага экзатычнага вострава.

Кажу пра гэта Максіму Пятровічу, і ён пагаджаецца:

— Пра востраў я так, да слова. А калі чэсна, то ніхто ніколі нікуды не змог перасадзіць мяне адсюль. Як вунь тую бярэзіну, што на панадворку...

Спускаліся ад кузні моўчкі.

— Аднак мне пара,— прамовіў напаследак дзед Максім,— а то, сапраўды, могуць раскупіць хлеб...

І пайшоў ад хутара ў вёску, трымаючы пад пахаю зрэбную торбачку, пайшоў напрасткі, сцяжынаю, пратаптанаю праз калодзезь у нізовінцы, праз аблесены суседні пагорак, пратаптанаю не кім староннім, а ім самім і не за дзень, не за два — за доўгія гады жыцця свайго.

● Напачатку можа паказацца, што «Апошні гусляр» — гэта звычайнае апавяданне: тут і расказчык, і галоўны герой, і пейзажныя замалёўкі, і розныя апісанні. Але гэта не апавяданне, гэта — нарыс. Падумайце і адкажыце: чым адрозніваецца паказ жыцця і людзей у нарысе і ў апавяданні? Свае адказы пацвердзіце прыкладамі з твора.

У вашым падручніку змешчана выдатная паэма Янкі Купалы «Курган», у якой таксама расказваецца пра гусляра. Чым розняцца гэтыя вобразы ў паэме і нарысе, у творы высока-паэтычным і ў творы празаічна-бытавога зместу?

Знайдзіце ў нарысе апісанне ігры гусляра, дзеда Максіма і параўнайце з тым, як гаворыцца пра ігру гусляра ў паэме: у чым розніца і падабенства?

Ахарактарызуйце дзеда Максіма як чалавека-самародка, майстра на ўсе рукі.

## *Пытанні і заданні да раздзела*

Што такое публіцыстыка? Якія ёсць віды публіцыстычных твораў?

Чым адрозніваецца публіцыстыка ад мастацкай літаратуры ў адносінах да паказу з'яў жыцця? Што яна «запазычвае» з мастацкай літаратуры для ўзмацнення свайго ўздзеяння на чытача?

У некаторых сваіх творах мастацкая літаратура цесна збліжаецца з публіцыстыкай. Прыкладам можа быць грамадзянская (грамадска-палітычная) паэзія,